Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

22 верасня 2014 года, № 13 (2116)

АКТУАЛЬНА

## БДУ ўпершыню ўвайшоў у 500 найлепшых універсітэтаў свету!

**Па выніках апублікаванага нядаўна рэйтынгу ўніверсітэтаў свету вядомага брытанскага агенцтва QS (THE - QS World University Rankings), БДУ упершыню ўвайшоў у топ-500 найлепшых універсітэтаў свету і размясціўся ў групе ВНУ, якія займаюць 491–500 пазіцыю.**

Агенцтва QS ужо 10 гадоў ранжыруе ўніверсітэты свету, і ў даследаванне звычайна ўключаюцца толькі першыя 700–800 універсітэтаў, ці 3 % усіх існых універсітэтаў.

На першым месцы Масачусецкі тэхналагічны інстытут (ЗША), за ім стаіць Кембрыджскі ўніверсітэт (Вялікабрытанія).

З расійскіх ВНУ лепшыя, чым у БДУ, пазіцыі ў МДУ імя М. В. Ламаносава – 114, СПбДУ – 233, МДТУ імя М. Э. Баўмана – 322 і яшчэ ў шасці расійскіх універсітэтаў.

Пазіцыі вядучых універсітэтаў суседніх дзяржаў: Варшаўскі ўніверсітэт – 335, Тартускі ўніверсітэт – 379, Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі – 421–430, Талінскі тэхнічны ўніверсітэт – 501–550, Вільнюскі ўніверсітэт – 551–600 і Латвійскі ўніверсітэт – 701+.




У рэйтынгу QS сярод беларускіх ВНУ ў 2014 г. акрамя БДУ ранжыруецца толькі Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (701+).

Рэйтынг QS засноўваецца на аналізе дадзеных пра ВНУ і апытаннях незалежных экспертаў. Ацэньваюцца: вынікі апытання экспертаў (акадэмічная рэпутацыя); вынікі апытання працадаўцаў; індэкс цытавання навуковых прац за апошнія 5 гадоў; суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў; колькасць замежных студэнтаў і выкладчыкаў.

За апошні час БДУ ў міжнародных рэйтынгах прадстаўлены вельмі годна і ўвесь час згадваецца ў ліку сусветных ВНУ «вышэйшай лігі». Так, па апошніх дадзеных (жнівень 2014) іспанскага рэйтынгавага агенцтва Webometrics Ranking of World Universities, БДУ заняў 673 месца ў свеце, а сярод ВНУ краін СНД, Грузіі, Латвіі, Літвы і Эстоніі, па дадзеных расійскага агенцтва «Інтэрфакс» (снежань 2013), знаходзіцца на другім месцы.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

КУЛЬТУРА

## Усе шляхі вядуць на Куфар

**XI Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар. БДУ–2014»** урачыста адкрыецца 22 верасня ў Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў (пр. Незалежнасці, 25). Пачатак у 18.30. Дэвіз мерапрыемства: «Усе шляхі вядуць на Куфар».



Маляўнічае дзейства пачнецца з перформанс-акцыі на пляцоўцы перад палацам. У імправізацыі будуць задзейнічаны госці фестывалю і валанцёры.

На сцэнічных пляцоўках сталіцы з 21 па 27 верасня будуць змагацца найлепшыя студэнцкія калектывы і тэатральныя дзеячы з 15 краін: Албаніі, Беларусі, Бельгіі, Бразіліі, Вялікабрытаніі, Германіі, Грузіі, Ірана, Італіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Румыніі, Украіны і Харватыі.

Адразу пасля афіцыйнага адкрыцця адбудзецца пастаноўка монаспектакля «Наташына мара» тэатра LAISVASIS TEATRAS (Клайпеда, Літва). Ён пройдзе ў рамках аўтарскага праекта «МонаК», які сёлета аднавіў сваю працу. «Наташына мара» – гэта гісторыя каханя і злачынства дзяўчынкі з дзіцячага дома, расказаная на сцэне толькі адной актрысай. Усяго госці фестывалю ўбачаць два монаспектаклі.

«Тэатральны куфар. БДУ–2014» з'яўляецца ўнікальным ва Усходняй Еўропе міжнародным фестывалем студэнцкіх тэатраў. За сваю гісторыю ён захаваў ключавыя праекты: «КуфарДрамаЛаб», «Куфар. by», «Kufar-in-Motion». На сталічных сцэнах свае мастацтва ўжо дэманстравалі больш за 2000 акцёраў.

У прыватнасці, «Куфар.by» пакажа найлепшыя дасягненні беларускіх студэнцкіх тэатраў. Большасць пастановак не ўвойдзе ў асноўную конкурсную праграму, аднак гледачы 21 верасня ўбачаць працы тэатральных калектываў з Мінска, Полацка і Гомеля.




Праект «Kufar-in-Motion» аб'яднае ўдзельнікаў з розных краін. Тут кароткі ў часавай прасторы і невялікі па форме створаны спектакль будзе «жыць» толькі адзін паказ. Нагадаем, гэтае сцэнічнае дзейства ствараецца за час працы фестывалю, г. зн. за 7 дзён. У ажыццяўленні гэтага праекта будуць задзейнічаны артысты фестывалю. Характэрна, што ацаніць пастаноўку і працу акцёраў тэатралы змогуць толькі на закрыцці мерапрыемства.

Акрамя таго, сёлетняе мерапрыемства пацешыць гасцей новай праграмай, прымеркаванай да 450-годдзя з дня нараджэння англійскага драматурга Уільяма Шэкспіра. У праекце «Шэкспір. Рэвізіт» будуць прадстаўлены пастаноўкі па яго творах. Удзельнічаць у гэтым «марафоне» шэкспіраўскіх п'ес запрашаныя 4 калектывы. Гэта творчая лабараторыя «Эскізы ў прасторы» Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў; польскі тэатр Krzywa Scena (г. Старгард-Шчэцінскі); студэнцкі тэатр Універсітэта імя Л. Блага (Сібіу, Румынія) і Пацційскі дзяржтэатр імя В. Гунія (Грузія).

Па традыцыі ацэньваць спектаклі будуць гледачы і міжнароднае журы. Яно вылучыць найлепшых рэжысёра і акцёраў.

Цырымонія закрыцця і ўзнагароджанне пераможцаў фестывалю пройдзе 27 верасня на сцэне Рэспубліканскага Палаца культуры прафсаюзаў. Пачатак у 20.00.

Праграма і навіны на афіцыйным сайце www.theatre-fest.bsu.by

**Паводле інфармацыі ўпраўлення па справах культуры**

### Чытайце ў нумары:

**ЛЕТА Ў «БРЫГАНЦІНЕ» ДОРЫЦЬ ЗДАРОЎЕ**
Амаль 500 супрацоўнікаў універсітэта з задавальненнем адпачываюць кожнае лета на базе БДУ пад Радашковічамі
Стар. 2

**ІБМТ ЗАЙМЕЎ НОВЫ ДОМ**
У новым корпусе Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій гістарычны фасад і сучаснае напаўненне
Стар. 3

**ЯРКАМУ ГОРАДУ – ЯРКАЕ СВЯТА!**
БДУ зладзіў маляўнічую прэзентацыю ў парку імя Міхаіла Паўлава, дзе прайшло свята «Квітней, мой родны Мінск!»
Стар. 4

### Весткі з рэктарата

МІЖНАРОДНЫ семінар «25 гадоў Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы (ЦЕІ)» адбыўся 16 верасня ў БДУ.

У ім бралі ўдзел намеснік міністра замежных спраў Беларусі Алена Купчына, рэктар БДУ Сяргей Абламейка, кіраўнік палітычнай секцыі Федэральнага міністэрства па еўрапейскіх і міжнародных справах Аўстрыі Ян Кікерт, альтэрнатыўны генеральны сакратар ЦЕІ Марджыт Вэстфельт, кіраўнік Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Майра Мора, а таксама дыпламаты.

Семінар прысвечаны ўмацаванню ролі ЦЕІ ў розных інтэграцыйных працэсах у Еўропе. Асноўная ўвага надавалася патэнцыйным напрамкам і прыкладному ўзаемадзеянню паміж ЦЕІ і ініцыятывай «Усходняе партнёрства», якое ахоплівае Беларусь, Малдову і Украіну.

* * *

У БДУ зацверджаныя новыя прызначэнні.

Дырэктарам Юрыдычнага каледжа БДУ стаў кандыдат юрыдычных навук *Алег Старавойтаў*.

На пасаду дырэктара Ліцэя БДУ зацверджаны кандыдат гістарычных навук *Макар Шніп*.

Прафесар *Віктар Гайсёнак* узначаліў Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ.

* * *

МАТЭРЫЯЛЬНАЯ дапамога аказаная ў БДУ 121 студэнту з ліку дзяцей-сірот, а таксама тых, хто страціў дадзены статус у сувязі з дасягненнем 23-гадовага ўзросту. Пры гэтым грашовыя выплаты атрымаюць як студэнты бюджэтнай формы навучання, так і платнай. Памер матэрыяльнай дапамогі складзе 1 150 000 рублёў кожнаму.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# ЛЕТА Ў «БРЫГАНЦІНЕ» ДОРЫЦЬ ЗДАРОЎЕ

**САК «Брыганціна» для многіх супрацоўнікаў БДУ стаў родным домам, куды яны могуць прыехаць на адпачынак кожным летам. Некаторыя сёлета ўпершыню адкрылі для сябе ўтульны куток пад Радашковічамі. І не пашкадавалі, што не паехалі ў далёкія краіны, бо беларускія краявіды не менш прывабныя.**



*Дарослыя з задавальненнем гулялі разам з дзецьмі ў «капітошку», ляпілі, размалёўвалі і танчылі*







Рэчка, бярозы над ёю, вадаспады і затокі з бабрамі, водар сасновага бору, мангалы для шашлыкоў на прыродзе парадавалі новых гасцей не менш, чым мора і стромкія горы. Сёлета ў жніўні ў «Брыганціне» адпачылі 467 супрацоўнікаў нашага ўніверсітэта і членаў іх сямей. «Было зроблена ўсё, што ў нашых сілах, каб іх знаходжанне на базе адпачынку ўспаміналася з прыемнасцю», – гаворыць дырэктар спартыўна-аздараўленчага комплексу Уладзімір ПАЛЯКОЎ.

Той, хто ўпершыню трапляе ў «Брыганціну» пад Радашковічамі, са здзіўленнем адкрывае, што апынуўся на тэрыторыі ў 13,6 га, дзе размясціліся 3 спальныя карпусы, адзін з якіх чакае рэканструкцыі, будынак з кінаканцэртнай залай на 400 пасадачных месцаў, сталовая на 320 месцаў, спартыўны комплекс са спартыўнай залай, басейнам, стадыён з полем для футбола, трыбунамі, трыма валейбольнымі і баскетбольнай пляцоўкамі, пляцоўкай для гарадкоў, а таксама летняя эстрада і месца для вогнішча.

## ДЗЕ БОЛЬШ ГАМАНЫ І РУХУ?

Першымі будынкамі, з якімі знаёмяцца супрацоўнікі БДУ і іх блізкія адразу пасля прыезду ў «Брыганціну», з'яўляюцца спальныя карпусы. Пакуль іх два, але пасля рэканструкцыі можна будзе спыніцца і ў трэцім. У адзін з іх накіроўваюцца госці без дзяцей, у другі – тыя, хто ўзяў з сабою сваіх нашчадкаў. Такое размяшчэнне пастаяльцаў скіравана на тое, каб улічваць інтарэсы і запатрабаванні людзей рознага ўзросту. У корпусе, у якім няма дзяцей, стаіць цішыня. Там, дзе дзеці, заўсёды больш гаманы і руху. І раздзяленне адпачывальнікаў такім чынам дазваляе пазбегнуць непаразуменняў і канфліктных сітуацый. Ужо раскладваючы свой багаж, прыезджыя заўважаюць нязвыклую чысціню як у шафах, так і ва ўсім пакоі, што ставарае своеасаблівую ўтульнасць. Генеральнае прыбіранне памяшканняў перад прыездам гасцей – галоўнае патрабаванне да персаналу базы адпачынку. Пакоі даволі прасторныя і разлічаны на 4 чалавекі. Таму часта сям'я з двух або трох чалавек мае ў распараджэнні яшчэ адзін лішні ложак, які на выхадныя дні можа заняць чаканы госць.

## СМАЧНА ЕСЦІ!

Другім месцам, якое таксама адыгрывае важную ролю ў адпачынку супрацоўнікаў БДУ, з'яўляецца сталовая. У першы дзень наведнікаў «Брыганціны» кормяць найбольш смачна (ці, можа, так проста здаецца з дарогі). Наварысты суп, ладны кавалак смажанага мяса з гарнірам, вітамінны салат, кампот. Вечарам дадаткова да асноўнай стравы даюць прысмакі: пячэнне, цукеркі, нектарын, бананы, апельсіны і іншую заморскую садавіну. А таксама абавязкова кефір.

Тут разумеюць, што харчаванне і здароўе непарыўна звязаны паміж сабой. Таму на працягу 12 дзён адпачывальнікам прапануюць збалансаванае пяціразовае харчаванне па меню, якое ўключае шырокі асартымент страў. Пры гэтым улічваецца густы людзей. На стале заўсёды прысутнічае садавіна і агародніна. Усіх прыемна здзіўляюць традыцыйныя стравы беларускай кухні, а таксама фірмовыя стравы ад галоўнага повара «Брыганціны».

Не адна сям'я на сабе даведалася, што такое здаровае харчаванне. У першыя дні ў «Брыганціне» многім здавалася, што столькі ежы не можа з'есці не толькі дзіця, але і дарослы. Аднак тыя, хто паважаў працу людзей на кухні, дамагаліся таго, што талеркі заставаліся пустымі.

Некаторым дзецям цяжка было прывыкнуць да разнастайнасці на стале: хтосьці любіць толькі сасіскі, а нехта ў штыкі ўспрымае марскую капусту. Аднак і з гэтай праблемай з цягам часу яны пачалі спраўляцца. І ў выніку вярнуліся дахаты дужэйшымі і з падлечанымі страўнікамі.

## УСЕ НА РЭЧКУ!

Пасля снедання і абеду госці спяшаюцца на рэчку. Той, хто лічыць, што няма нічога лепшага за мора, памыляецца. Можа, і не варта іх параўноўваць, аднак хочацца падкрэсліць, што рэчка побач з «Брыганцінай» адмысловая. Яна належыць да паркавай гідрасістэмы «Сасновы бор», і купанне ў ёй прыносіць непаўторную асалоду. Розныя цячэнні і крынічкі робяць ваду ў рацэ чыстай і прахалоднай. Акунуўшыся ў яе раніцай, адчуваеш прыліў сілаў і бадзёрасць. Пясчаны бераг, сосны і танюткія бярозы на беразе толькі дапамагаюць расслабіцца. Калі хочацца абследаваць усе затокі, можна звярнуцца па дапамогу на лодачную станцыю. Лодкі і водныя веласіпеды тут каштуюць у некалькі разоў танней, чым у Мінску. Яны могуць адвезці дапытлівых на невялічкія астраўкі, дзе цішыня і спакой настройваюць на рамантычны лад. Карацей кажучы, у «Брыганціне» ёсць дзе супакоіць нервы.

## ВУЧЫМСЯ ПЛАВАЦЬ

Басейн, які працуе на базе адпачынку кожны дзень акрамя выходных, таксама карыстаецца попытам у супрацоўнікаў нашага ўніверсітэта. Першыя наведнікі тут з'яўляюцца ўжо ў 10 гадзін раніцы. Бацькі вядуць сюды самых маленькіх дзяцей, бо вада ў басейне падаграецца і сам ён неглыбокі. Менавіта ў басейне «Брыганціны» многія дзеці вучацца плаваць. Гэтаму спрыяюць і спаборніцтвы па плаванні. Пераможцы атрымліваюць салодкія прызы.

Дарэчы, наведванне басейна, а таксама спартыўнай залы для многіх становіцца адным з асноўных заняткаў у другой палове жніўня, калі прыходзяць дажджы і рэчка перастае карыстацца папулярнасцю. Шмат хто пачынае гуляць у настольны тэніс, більярд, баскетбол і валейбол. Спартыўны інвентар: мячы, бадмінтон, скакалкі, шашкі – можна ўзяць у спартыўным комплексе бясплатна.

## ВЫБІРАЕМ ГУРТКІ

Дзеці ў халоднае надвор'е выбіраюць гурткі. Малыя ахвотна малююць, лепяць з гліны, спаборнічаюць на спартыўнай пляцоўцы, высвятляюць, хто хутчэй плавае, лепш гуляе ў тэніс, спяваюць, шукаюць скарбы ў лесе і г. д. Якраз гэта з прыемнасцю ўспамінаецца цяпер, калі яны селі за школьныя парты.

Апошні канцэрт у «Брыганціне» таксама ладзіцца ў асноўным сіламі дзяцей супрацоўнікаў БДУ. Бацькі абавязкова прыходзяць паглядзець, якое выступленне прыдумалі іх нашчадкі. Хтосьці з іх на сцэне ў «Брыганціне» не першы раз і ўжо лічыцца мясцовай зоркай, а хтосьці яе толькі асвойвае, ёсць і такія, што выходзяць на падмосткі ўпершыню і маюць магчымасць выпрабаваць сілы ў новай для сябе ролі. Штогадовы фестываль, які ладзяць наведнікі «Брыганціны» ўлетку, і называецца «Зоркавы дождж», бо менавіта на ім часам адкрываюцца сапраўдныя таленты.

Дарэчы, на працягу ўсяго адпачынку бацькі маюць магчымасць аддаць сваіх дзяцей выхавальніцы і забраць перад абедам. Спальны корпус пусцее, калі малыя вечарам адпраўляюцца ў кінатэатр паглядзець мультфільмы. Гэтыя гадзіны вольныя для бацькоў.

## ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ Ў ЛЮБЫ ЧАС!

Дырэктар спартыўна-аздараўленчага комплексу «Брыганціна» Уладзімір Палякоў гаворыць, што няблага было б арганізоўваць аздараўленчыя лагеры не толькі ўлетку, але і зімой. Пакуль зімой адпачынак для сваіх супрацоўнікаў арганізуюць толькі асобныя факультэты, напрыклад, юрыдычны, гістарычны, біялагічны і іншыя. Асобных гасцей тут не прымаюць, бо выгадней працаваць з групамі ў 200–250 чалавек. Уладзімір Аляксандравіч спадзяецца, што калі першы корпус згодна з праектам будзе рэканструяваны ў дом адпачынку, а інтэрнат для абслуговага персаналу пераўтворыцца ў гасцініцу, то ў супрацоўнікаў з'явіцца магчымасць прыязджаць сюды ў любы момант і на любы час, нават на адзін дзень.

## ЦІКАВА

Акрамя аздараўлення, на базе САК «Брыганціна» арганізуюцца адукацыйныя канферэнцыі, вучоба актыву, семінары, міжнародныя студэнцкія форумы і фестывалі, штогадовыя навучальныя практыкі студэнтаў 2–3 курсаў завочнага аддзялення біялагічнага факультэта, спартыўныя мерапрыемствы. У многіх яны на слыху. Напрыклад, міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар», міжнародны форум студэнцкіх хароў «Папараць-кветка», рэспубліканскі семінар-практыкум «Зімняя школа студэнцкай журналістыкі», міжнародны студэнцкі форум «Свята Вялікай Перамогі» і іншыя. Такія выязныя семінары-практыкумы для студэнцкай моладзі, як «Школа студэнцкага актыву» Студэнцкага гарадка БДУ, «Ты староста!» для старастаў навучальных груп 1 курса, злёты і навучальныя семінары для актыву БРСМ і іншыя, даўно сталі традыцыйнымі для «Брыганціны».

Аднак на гэтых мерапрыемствах, як і на адпачынку супрацоўнікаў БДУ, САК «Брыганціна» грошай не зарабляе. Часцяком тут на выхадных адпачываюць супрацоўнікі іншых арганізацый – «Крыніцы», «Мілавіцы», «Белэнерга»... Менавіта ад такой дзейнасці базы адпачынку БДУ атрымлівае прыбытак.

**Ганна ЛАГУН**

ПАДЗЕЯ

# ІБМТ займеў новы дом

**1 верасня ўрачыста адкрыўся новы навучальны корпус Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій.** На цырымоніі прысутнічалі ганаровыя госці, у ліку якіх рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, а таксама прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі і эканомікі.

Новы корпус ІБМТ мае шэраг пераваг і асаблівасцяў. Будынак знаходзіцца па вул. Маскоўская, 5, а гэта практычна цэнтр сталіцы. Калі трэба хутка кудысьці дабрацца, у гэтым дапаможа сталічны метрапалітэн, станцыя якога размешчана за 5 хвілін хады ад установы адукацыі. Новы корпус ІБМТ здзівіць госця сучасным рамонтам, прасторнымі аўдыторыямі, аснашчанымі мультымедыйнымі сістэмамі і камп'ютарным абсталяваннем. Гэта дазволіць праводзіць відэаканферэнцыі і вэбінары.

Па словах дырэктара Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій *Уладзіміра Апанасовіча*, атрыманне ўласнага навучальнага корпуса з'явілася першарадный мэтай. ІБМТ – самае маладое падраздзяленне БДУ. Таму, калі ўстанова ствааралася, усе пляцоўкі былі заняты рознымі факультэтамі. Гэта вымусіла арганізаваць дзейнасць на пляцоўках, якія былі замацаваны за іншымі навучальнымі падраздзяленнямі. У 2010 г. Белдзяржуніверсітэт перадаў у карыстанне інстытуту будынак, які быў выведзены з навучальнага працэсу, бо патрабаваў рамонту. За чатыры гады ІБМТ уклаў значныя фінансавыя сродкі, што спрыяла годнай рэалізацыі запланаванага праекта.

Навучальны корпус быў збудаваны ў 1929 г. і з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Уладзімір Уладзіміравіч заўважыў, што гэты факт наклаў пэўную адказнасць і ўнёс асаблівасці ў правядзенне капітальнага рамонту.



Стварэнне праекта і рэканструкцыя запатрабавала дадатковых высілкаў. Няпроста было захаваць фасад будынка і асобныя элементы канструкцыі. Што да ўнутранага напаўнення, у спецыялістаў была поўная свабода. Аўдыторыі і кабінеты праектаваліся, зыходзячы з патрабаванняў арганізацыі навучальнага працэсу. Таму, нароўні з першародным вонкавым выглядам навучальнага корпуса, «функцыянал» будынка адпавядае ўсім сучасным патрабаванням.

Высокія тэхналогіі, выдатнае аснашчэнне будынка, выгаднае месцазнаходжанне – усё гэта цалкам адпавядае высокаму статусу ВНУ. Калі вы абітурыент, які ніяк не можа вырашыць, у якую навучальную ўстанову з эканамічным ухілам паступіць, проста прыйдзіце ў ІБМТ у дзень адчыненых дзвярэй. І, магчыма, ваш выбар спыніцца менавіта на гэтым інстытуце.

**Аляксей СМОЛЬСКІ**



Фота Аляксандра СНАПКА

ДАСЯГНЕННІ

# Выданні БДУ адзначаныя на конкурсе ў Казані

Друкаваная прадукцыя БДУ атрымала 7 дыпломаў і 2 граматы на міжнародным галіновым конкурсе выданняў вышэйшых навучальных устаноў «Універсітэцкая кніга 2014 года: сацыяльна-гуманітарныя навукі». Конкурс праходзіў на базе Інстытута эканомікі, кіравання і права г. Казань.

Дыпломамі былі адзначаны выданні з серыі «Класічнае ўніверсітэцкае выданне»: **Гарнік А. В., Шаўчэнка Г. І. «Лацінская мова = Lingua Latina» (**2012) – *найлепшае вучэбнае выданне па мовазнаўстве і літаратуразнаўстве*; **«Сацыялогія»** (2012) – *найлепшае вучэбнае выданне па сацыялогіі;* **«Экалагічнае права»** (2013) – *найлепшае вучэбнае выданне па юрыспрудэнцыі.* Акрамя таго, **«Расійскія і славянскія даследаванні: навуковы зборнік. Вып. 8»** (2013) – *найлепшы зборнік навуковых артыкулаў;* **Варычэнка Г. У., Кішкевіч А.В., Праконіна Ж. В. «Руская мова як замежная (базавы ўзровень)»** (2012) – *найлепшае вучэбнае выданне па мовазнаўстве і літаратуразнаўстве;* **Сцёпін В. С. «Навуковае пазнанне ў сацыяльным кантэксце. Выбраныя працы»** (2012) – *найлепшае навуковае выданне па філасофіі;* часопіс **«Веснік БДУ»** – серыя 4. 2013. № 1; серыя 3. 2013. № 3 – *найлепшае перыядычнае выданне.*

Выданне **«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у юбілейны год. 90 гадоў»** (2012) і № 2 за 2014 г. **газеты «Універсітэт»** адзначаны граматамі ў намінацыі *«Найлепшае паліграфічнае выданне»* і *«Найлепшая ўніверсітэцкая газета»* адпаведна.




Адзначым, удзельнікамі конкурсу выступілі выдавецтвы і рэдакцыйна-выдавецкія аддзелы вышэйшых навучальных устаноў Расіі, краін блізкага і далёкага замежжа, якія выпускаюць вучэбную і навуковую літаратуру па эканамічных і юрыдычных напрамках.

Асноўныя мэты мерапрыемствы накіраваны на падтрымку аўтарскіх калектываў, заахвочванне сучасных выдавецкіх праектаў ВНУ, павышэнне ўзроўню рэдакцыйна-выдавецкай падрыхтоўкі, паліграфічнага выканання і мастацкага афармлення падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў, аспірантаў, слухачоў падраздзяленняў дадатковай прафесійнай адукацыі, а таксама навуковых, навукова-папулярных і іншых відаў універсітэцкіх выданняў.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**08 верасня Чыгір Васіль Фёдаравіч,** прафесар кафедры граматычнага права

**10 верасня Каратаеў Мікалай Адамавіч,** вядучы інжынер-праграміст навучальнай лабараторыі эксплуатацыі ЭВМ

**10 верасня Рабцаў Аляксандр Мікалаевіч,** прафесар кафедры арганічнай хіміі

**10 верасня Макеева Святлана Аляксандраўна,** дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі

**11 верасня Кузняцова Іна Аляксандраўна,** дацэнт кафедры паліталогіі

**18 верасня Матузка Аляксандр Мікалаевіч,** дацэнт кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій

**22 верасня Аксючыц Ірына Віктараўна,** дацэнт кафедры псіхалогіі

*Спіс размешчаны на сайце www.bsu.by у раздзеле «Нашы юбіляры».*

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай оптыкі, заалогіі, міжнароднага турызму,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: беларускай літаратуры і культуры, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, экалагічнага і аграрнага права, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, міжнародных адносін,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі, фізічнай інфарматыкі і атамна-малекулярнай фізікі, вылічальнай матэматыкі, матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных, шматпрацэсарных сістэм і сетак, агульнай фізікі, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, міжнароднага менеджменту, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, батанікі, геаграфічнай экалогіі, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, гісторыі беларускай мовы, грамадзянскага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крымінальнага права, паліталогіі, экалагічнага і аграрнага права, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, замежнай журналістыкі і літаратуры, літаратурна-мастацкай крытыкі, перыядычнага друку, тэхналогій камунікацыі, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, функцыянальнага аналізу, дыпламатычнай і консульскай службы, міжнароднага права, тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, фізічнай інфарматыкі і атамна-малекулярнай фізікі, фізікі і аэракасмічных тэхналогій, інфарматыкі і камп'ютарных сістэм, радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, інфармацыйных сістэм кіравання, шматпрацэсарных сістэм і сетак, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, эканамічнай геаграфіі замежных краін, англійскага мовазнаўства, нямецкага мовазнаўства, прыкладной лінгвістыкі, грамадзянскага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, канстытуцыйнага права, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, літаратурна-мастацкай крытыкі, медыялогіі і вэб-журналістыкі, перыядычнага друку, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, германскіх моў, мытнай справы, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: нямецкага мовазнаўства, прыкладной лінгвістыкі, тэхналогій камунікацыі, тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай, фізічнага выхавання і спорту,

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, вылічальнай матэматыкі, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, камп'ютарных тэхналогій і сістэм, заалогіі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**НДУ «НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-НАВУЧАЛЬНЫ ЦЭНТР ФІЗІКІ ЧАСЦІЦ І ВЫСОКІХ ЭНЕРГІЙ» БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫК ЛАБАРАТОРЫІ фундаментальных узаемадзеянняў;

МАЛОДШЫ НАВУКОВЫ СУПРАЦОЎНІК лабараторыі квантавай тэорыі поля.

*Тэрмін падачы дакументаў – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220088, г. Мінск, вул. Першамайская, 18, пакой 403. Тэл. 292-60-34.*

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ДАЦЭНТА кафедры маркетынгу;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры кіравання фінансамі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.*

**НДУ «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БДУ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНАЙ ПАСАДЫ:**

МАЛОДШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі спецыялізаваных вылічальных сістэм па спецыяльнасці 05.13.01 (сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі).

*Тэрмін конкурсу – 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220045, г. Мінск, вул. Курчатава, 7. Тэл. 212-48-43.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Інтэрв'ю рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі** – «Настаўніцкая газета», nastgaz.by, «Звязда», zviazda.by (30.08).

**БДУ ўпершыню ўвайшоў у топ-500 ВНУ свету** – АНТ, ex-press.by, minsknews.by, generation.by,Tut.by, naviny.by, newsbook.info, sb.by (16.09).

**Імпрэза Дня ведаў у БДУ** – interfax.by (31.08), ТБ «24-ДОК», БелТА, Tut.by, minsknews.by, megacat.by (01.09).

**Пра загадчыка кафедры клеткавай біялогі і біяінжынеры раслін біялагічнага факультэта БДУ Вадзіма Дзямідчыка** – onliner.by, megacat.by, minsknews.by, mk.by (02.09), Tut.by (03.09).

**Перадача бразільскіх аметыстаў музею землязнаўства геаграфічнага факультэта БДУ** – soyuz.by (27.08), tio.by (28.08).

**Прэс-канферэнцыя, прысвечаная XI Міжнароднаму фэсту студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар. БДУ – 2014»** – Tut.by (04.09), belarus.by, 21.by, БелТА (05.09), zviazda.by (07.09), interfax.by (08.09), БелаПАН, naviny.by (09.09), «Настаўніцкая газета», «Савецкая Беларусь», СТБ (11.09).

**Выданні БДУ адзначаныя на міжнародным галіновым конкурсе выданняў вышэйшых навучальных устаноў «Універсітэцкая кніга 2014 года: сацыяльна-гуманітарныя навукі» ў Казані** – zviazda.by, БелТА (03.09).

**Старшыня Італьянскага таварыства міжнародных арганізацый Франка Фратыні выступіў з лекцыяй у БДУ** – interfax.by, БелаПАН (11.09), СТБ, БелТА, megacat.by (13.09).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Яркаму гораду – яркае свята!

**13 верасня 2014 г. горад Мінск святкаваў сваё 947-годдзе** фэстамі, святочнымі канцэртамі і забаўляльнымі мерапрыемствамі. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт размясціўся на пляцоўцы ў парку імя Міхаіла Паўлава, дзе прайшло свята «Квітней, мой родны Мінск!». Тут прайшло ўзнагароджанне пераможцаў агляду-конкурсу на найлепшае добраўпарадкаванне тэрыторы сярод устаноў, фірмаў і арганізацый раёна, а таксама звычайных гараджан.









Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю і фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта арганізавалі інтэрактыўныя прадстаўленні ў выглядзе фізічных вопытаў і імправізаваных выступленняў мімаў ад фундаваных універсітэтам праектаў «Лекторый па эксперыментальнай фізіцы» і «Творчая студыя МіМ-BSU».

Публіка на прадстаўленнях была ўсіх узростаў, «вохі» і «ахі» ад убачаных вопытаў даносіліся як ад дзяцей, так і ад больш сталага пакалення. А для найбольш дапытлівых мінчукоў Ілья Якавец, кіраўнік праекта «Лекторый па эксперыментальнай фізіцы», правёў невялікую лекцыю, распавёўшы, як жа адбываюцца ўсе тыя «цуды», якімі яны дзівяць гледачоў.

Псіхалагічная служба Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта арганізавала цікавыя псіхалагічныя трэнінгі для псіхадыягностыкі асобы. За некалькі гадзін працы ахвотнікаў пазнаць сваё таемнае «я» знайшлося больш за 250 чалавек. Экспрэс-метад дазволіў мінчукам даведацца, якія рысы пераважаюць у іх характары, да чаго трэба імкнуцца і што неабходна змяніць у сабе.

Удзельнікі кірунку FaceArt творчай студыі MiM-BSU аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ размалявалі ўсіх ахвотнікаў у яркія фарбы мінулага лета і любімага горада, а асабліва актыўныя дзеці звярталіся па малюнак на сваім твары некалькі разоў. Жыццярадасныя мімы ўпрыгожылі фатаграфіі мінчукоў.

І, вядома, упраўленне па справах культуры, як заўсёды, пацешыла гледачоў запальнымі танцавальнымі і вакальнымі нумарамі студэнтаў і творчых калектываў на сцэнічнай пляцоўцы парку. Дзівосную праграму, насычаную нацыянальным каларытам, паказаў ансамбль «Тутэйшая шляхта».

Выдатнае надвор'е, святочны настрой і мноства гледачоў каля палатак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – так запомніўся гэты суботні дзень мінчукам і гасцям сталіцы!

**Іван ЖУКАЎ,**
**метадыст аддзела моладзевых праграм і праектаў УВРМ**

ВІНШУЕМ!

**Студэнцкі гарадок БДУ – гэта адна вялікая і дружная сям'я! 6 верасня яму споўнілася 40 гадоў!** Як і ў любы юбілей, не абышлося без імпрэз, падарункаў і віншаванняў.





# СТУДГАРАДОК СВЯТКУЕ ЮБІЛЕЙ!

Серыя святочных мерапрыемстваў пачалася 5 верасня з урачыстага пасяджэння з нагоды 40-годдзя студэнцкага гарадка, якое прайшло ў зале Савета БДУ. На ім прысутнічалі ганаровыя госці, сярод якіх намеснік міністра адукацыі Беларусі Віктар Якжык і рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка. На цырымоніі найлепшыя працаўнікі студэнцкага гарадка былі адзначаны рознымі ўзнагародамі: граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, граматамі, ганаровымі граматамі і падзякамі рэктара БДУ, а таксама ганаровымі граматамі прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў БДУ.

Аднак Студэнцкі гарадок БДУ – гэта ў першую чаргу студэнты! Тыя, хто задае рытм яго жыццю і стварае настрой. У інтэрнатах студэнты адсвяткавалі 40-годдзе свайго агульнага дома вялікай колькасцю акцый па выпуску віншавальных паштовак і канцэртнымі праграмамі, а ў чацвёртым інтэрнаце 5 верасня прайшоў цэлы «Марафон віншаванняў».

Самым гучным акордам у чарадзе імпрэз стала вечарына THE CAMPUS MONDAY, якая аб'яднала ўсіх жыхароў студэнцкіх інтэрнатаў 15 верасня ў клубе «НЛА». Арганізаваў свята каардынацыйны савет студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ. Дзякуючы вядучаму Дзмітрыю Нікалайзену, вечар запомніўся толькі добрым настроем, усмешкамі сяброў і морам віншаванняў. Не абышлося і без неспадзевак: зараджала пазітывам творчая студыя Mim-BSU (мімы «ГрымМы»); Ягор Бордак, чалавек-чараўнік, адмыслова для гасцей паказаў незабыўнае шоў мыльных бурбалак і прымусіў паверыць у немагчымае. А дзякуючы гурту Intelligency, дыджэю VitWalker і студэнткам Валянціне Паўлавай і Лізавеце Гарбузовай у клубе гучалі толькі самыя лепшая музыка і песні.

Адной з галоўных неспадзевак для ўсіх удзельнікаў вечарыны стаў велізарны торт, свечкі на якім задзьмулі сябры каардынацыйнага савета студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ ў гонар любімага студэнцкага гарадка.

Прыемна ўсведамляць, што студэнцкі гарадок вось ужо на працягу 40 гадоў робіць жыццё кожнага з вялікай сям'і цікавым, яркім і незабыўным. Час не стаіць на месцы, а студэнцкі гарадок упэўнена ідзе з ім у нагу.

**Рыгор КРАЎЧУК**

**Паважаныя чытачы!**
На сайце газеты «Універсітэт» **www.gazeta.bsu.by** вы зможаце пачытаць шмат дадатковых матэрыялаў, што не трапілі ў нумар. Гэта рэпартаж пра святкаванне Дня ведаў у БДУ, у тым ліку імпрэзы «Віват, студэнт», апытанне першакурснікаў пра іх уражанні ад паступлення і першых тыдняў вучобы ў БДУ, падсумаванне вынікаў прыёмнай кампаніі–2014 у БДУ, інтэрв'ю з галоўным рэдактарам «Універсітэта» Сяргеем Шафаловічам, нарыс пра летнія «палявыя» практыкі нашых студэнтаў, матэрыялы па псіхалогіі асобы і многія іншыя.
Не прамініце!

**Рэдакцыя газеты «Універсітэт»**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года
22 верасня 2014 года
Падпісана да друку 18.08.2014 г.
Зак. ___. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*